

# Апацкая Лізавета Ігнатаўна

(нар. 14 мая 1920 г.) — працуе ў бібліятэцы з 1946 г. Ад нам. бібліятэкара да заг. аддзела беларускай літаратуры і бібліяграфіі — такі працоўны шлях Лізаветы Ігнатаўны.

Апацкая з'яўляецца вялікім спецыялістам у галіне беларускага кнігазнаўства і бібліяграфіі. Праводзіць вялікую работу па прапагандзе беларускай кнігі, многа ўвагі ўдзяляе развіццю краязнаўчай работы ў рэспубліцы.

Прымае актыўны ўдзел у грамадскай рабоце бібліятэкі, выбіралася старшынёй мясцкома, з'яўляецца прапагандыстам у сетцы палітасветы.

Узнагароджана медалямі „Партизану Отечественной войны I степени", „За трудовую доблесть", „За доблестный труд. В ознаменование 100-летия со дня рождения В. И. Ленина", Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, значком Міністэрства культуры СССР „За отличную работу", Ганаровай граматай Міністэрства культуры БССР.

Прыказам па бібліятэцы ад 2 лютага 1976 г. за высокія паказчыкі ў выкананні вытворчых планаў і сацабавязацельстваў у 9-й пяцігодцы, высокую культуру абслугоўвання чытачоў, вялікую работу па развіццю бібліятэчнай справы ў рэспубліцы, шматгадовую і актыўную працу ў бібліятэцы Апацкая Л. І. занесена ў Кнігу Народнай Славы бібліятэкі.